МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

23 лютага 2018 г. № 8 (441)

стар. 3

Глядзіце, хто прыйшоў!

стар. 4

Не канкурэнцыяй адзінай

стар. 15

Дзікія звяры ў няволі

ТЭМА ТЫДНЯ

ГАНДАЛЬ НА ВЁСЦЫ:

ці будуць улічаныя інтарэсы сельскіх жыхароў?

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

АБСЛУГОЎВАННЕ насельніцтва сельскай мясцовасці патрабуе асобнай увагі ва ўмовах абвастрэння канкурэнцыі ў гандлі ў раённых цэнтрах. Да такой высновы прыйшлі прадстаўнікі Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі і праўлення Белкаапсаюза падчас выязнога пасяджэння ў Паставах, падрыхтаванага Пастаяннай камісіяй Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні. У цэлым, па словах старшыні Савета Рэспублікі Міхаіла МЯСНІКОВІЧА, абслугоўванне вяскоўцаў патрабуе комплекснага падыходу.

стар. 4

ПАЕХАЛІ!

З МАЛОГА КРАСНІКА — У ВЯЛІКІ І ЯШЧЭ Ў 17 ВЁСАК ЗА ДЗЕНЬ

Аўтакрама як сацыяльны праект спажыўкааперацыі

У Малы Краснік аўтакрама прыбыла па графіку. Пасля таго як кіроўца пасігналіў, з варот бліжніх дамоў выйшлі двое мужчын. Так, на гэты раз магазін на колах наведалі толькі два пакупнікі. Адзін з іх, Мікалай Дакімовіч, быў рады выпадку пагаварыць з людзьмі. Ахвотна расказваў нам, што раней у вёсцы на 30 двароў быў статак у 45 кароў: «А цяпер ні курыцы, ні пеўня, каб хоць ранкам пабудзіць. А жыхароў засталося ўсяго чацвёра».

Свой чалавек у вёсцы

Мужчыны купілі прадуктаў (сярэдні чэк каля 10 рублёў — **Аўт.**) ды разышліся па хатах. **Прадавец Дар'я КАЗАКУ** хуценька выскачыла з гандлёвага фургона, перасела ў кабіну, кіроўца Уладзімір Шэльвах закрыў вітрыну, і крама на колах пайшла далей. Я адразу прыкінула, колькі разоў за змену Дар'і даводзіцца вось так выскокваць-заскокваць, калі на адным маршруце, такім як сёння, 19 вёсак, у некаторых з іх гандлёвая машына робіць прыпынак тры разы. Ды і абслугоўванне пакупнікоў ва ўмовах фургона — працэс нялёгкі: узяць тавар, нахіліцца да акенца, падаць, потым разлічыць пакупніка. Ад гэтых паклонаў, відаць, спіна ўвечары гудзіць. Але Дар'я не скардзіцца, кажа, што прызвычаілася і работа ёй падабаецца.

У Вялікім Красніку на першым прыпынку машыну ўжо чакалі з паўдзясятка жанчын. Стараста вёскі Аляксандра Шарашовец сказала, што работай свайго перасоўнага гандлёвага пункта вяскоўцы задаволеныя. «Прадавец наша прыветлівая, усё, што просім, прывозіць». Старасту падтрымалі і іншыя. Антаніна Несцераўна Васіленка сказала, што сама адпрацавала ў сельскім гандлі больш за 30 гадоў, таму можа ацаніць работу калегі з веданнем справы. «Вось мне яна мазь для націрання прывезла. Гэта ж не яе работа — бегаць па аптэках у свой вольны час. Але ж каго нам папрасіць тыя лекі даставіць хутка, калі дзеці жывуць далёка? Значыць, Дар'я — сапраўдны работнік сельскага гандлю, добры і чулы».

Ганна Курыловіч, былая даярка, адзначыла такую якасць свайго прадаўца, як цярплівасць: «Тут жа ўсе старыя, не вельмі здаровыя, часам нястрыманыя. А яна ніколі голас не павысіць, усё па-добраму, з гумарам, з аптымізмам. Таму і хадзіць хочацца ды купляць».

Кіроўца Уладзімір ШЭЛЬВАХ.

У Вялікім Красніку аўтакрама робіць прыпынак тройчы. Потым разварочваецца і бярэ курс на наступны населены пункт. Усюды трэба паспець па графіку, бо на кожным яе прыпынку вісіць расклад прыбыцця. Дар'я Казаку расказала, што ўжо ўзяла для рэалізацыі штучныя кветкі, а таксама насенне, якое пачынаюць высяваць на расаду. Прадукты вяскоўцы купляюць самыя розныя. Апошнім часам папулярнасцю карыстаюцца паўфабрыкаты: катлеты, галубцы, каўбаскі свойскія, студзень у кантэйнерах. Сельскія жыхары купляюць і сала, а раней гэты прадукт у кожнага быў свой. Ну і традыцыйны набор: малако, хлеб, крупы.

стар. 14